УДК 373.3.035.6

***В.Б. Вронская***
(ДУА «Сярэдняя школа № 6 г. Магілёва»)

## ВЫХАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ РОДНАЙ МОВЫ

*Выкладанне беларускай мовы – аснова вырашэння актуальнай задачы нашай сучаснасці – фарміраванне і ўмацаванне нацыянальнай свядомасці нашых дзяцей. Урокі беларускай мовы і літаратурнага чытання спрыяюць вырашэнню актуальных выхаваўчых задач, адраджэнню духоўнасці.*

Школе належыць асаблівая роля ў станаўленні і развіцці нацыянальнай свядомасці. Кожны навучальны прадмет змяшчае пэўнае кола ідэй, якія ўплываюць на фарміраванне нацыянальнай свядомасці. Аднак знакамітыя асветнікі ўсіх часоў і народаў лічылі, што на свеце няма такой велічыні, якую па сіле ўздзеяння на свядомасць чалавека можна было б параўнаць з родным словам. Менавіта яму належыць пэўная роля ў фарміраванні нацыянальнага светапогляду. Мова бацькоў, нацыянальная літаратура і фальклор – спосаб і сродак духоўнага развіцця. Таму выкладанне беларускай мовы – аснова вырашэння актуальнай задачы нашай сучаснасці – фарміравання і ўмацавання нацыянальнай свядомасці нашых дзяцей. Я не выпадкова ўзяла словы выдатнага рускага пісьменніка, закаханага ў прыгажосць сваёй роднай мовы, Канстанціна Паўстоўскага: «Сапраўдная любоў да сваёй краіны немагчыма без любові да сваёй мовы». Неабходна памятаць, што нацыянальная свядомасць фарміруецца на аснове пазнання і асэнсавання вучнямі агульначалавечых духоўных каштоўнасцей. Праблему фарміравання нацыянальнай свядомасці школьнікаў трэба вырашаць шляхам гуманізацыі адукацыі, укаранення выхаваўчага навучання, сувязі выхавання з жыццём. Ва ўмовах рэфармавання школы грамадству патрэбен не проста працаўнік, а творца матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Гэта знайшло адлюстраванне ў сучаснай Канцэпцыі выхавання школьнікаў і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь: «Галоўная мэта выхавання – духоўна багатая асоба, арыентаваная на агульначалавечыя каштоўнасці».

Далучэнне дзяцей да жыцця праз мастацтва слова, культуру, традыцыі народа дапаможа выхаваць у іх высокія духоўна-маральныя якасці, развіць эмацыянальную сферу, творчыя здольнасці, эстэтычна ўзбагаціць. Лічу, што галоўная ўмова эфектыўнага фарміравання нацыянальнай свядомасці падрастаючага пакалення – гэта стварэнне своеасаблівай атмасферы, якая спрыяе пазнанню асноўных каштоўнасцей жыцця – дабрыні, любові, прыгажосці. Каб сфарміраваць асобу, якой уласцівы гуманізм, чалавечнасць, сумленнасць, паважлівыя адносіны да людзей, да навакольнага асяроддзя, неабходна прытрымлівацца прынцыпу «навучаючы – выхоўваць».

У Канцэпцыі моўнай адукацыі малодшых школьнікаў адзначаецца, што фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці – гэта праблема засваення дзецьмі роднай мовы, гісторыі, культуры [1]. Задачы навучання беларускай мове ў I–IV класах у межах лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый наступныя: фарміраваць асэнсаванае ўспрыманне беларускай літаратурнай мовы як сродку замацавання маральных каштоўнасцей грамадства; актывізаваць пазнавальныя памкненні ў спасціжэнні беларускай нацыянальнай культуры, захаванні культурных традыцый [2, с. 3]. Урокі беларускай мовы і літаратурнага чытання спрыяюць вырашэнню актуальных выхаваўчых задач, адраджэнню духоўнасці. Дасягнуць станоўчых вынікаў без жадання школьнікаў ведаць і



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вывучаць мову, пры адсутнасці цікавасці да прадмета немагчыма. Слова ўздзейнічае на дзіця своеасабліва, і авалодаць ім неабходна ў дзяцінстве. Задача настаўніка пачатковых класаў – дапамагаць школьнікам паступова ўваходзіць у свет літаратурнай мовы, рабіць яе сродкам пазнання наваколля, абмену думкамі, развіцця мыслення [2, с. 21]. Выхаванню нацыянальнай свядомасці садзейнічае выкарыстанне на ўроках дадатковага дыдактычнага матэрыялу, у тым ліку сродкаў народнай педагогікі: прымавак, прыказак, загадак, казак, легендаў. Нельга недаацэньваць сувязь развіцця мовы з развіццём мыслення, разуменнем свету, жыццёвым вопытам. Абапіраючыся на вопыт дзіцяці, можна правесці гутарку на тэму «Навошта нам мова? », у выніку якой малодшыя школьнікі змогуць самастойна растлумачыць, для чаго яны вывучаюць беларускую мову. Роднае слова, матчына мова спрадвеку лічыліся найвялікшым скарбам народа, яго візітнай карткай, першай крыніцай спазнання жыцця. Бясспрэчнай з'яўляецца ісціна: пакуль жыве народ, жыве і яго мова, што перадаецца як спадчына з пакалення ў пакаленне.

Вялікую ролю ў выхаванні нацыянальнай свядомасці адыгрываюць творы фальклору. Чароўнасць народных казак, лірызм песняў, трапнасць прыказак і прымавак, мудрасць загадак – усё гэта садзейнічае выхаванню высокіх грамадзянскіх і патрыятычных пачуццяў. Беларусы заўсёды імкнуліся фарміраваць у дзяцей пачуццё дабрыні, прыгажосці, сардэчнасці праз развіццё іх пачуццёва-эмацыянальнай сферы. Дзіця з маленства чуе голас маці, якая напявае яму калыханку. У пачатковай школе дзеці вяртаюцца да калыханак. На ўроках трэба стварыць умовы для новай сустрэчы з калыханкамі, поўнымі цеплыні, пяшчоты, мілагучнасці, прыгажосці і дабрыні. Таму лепш не чытаць, а спяваць калыханкі.

Казка – адзін з самых эфектыўных сродкаў народнай педагогікі. На ўроках літаратурнага чытання варта абмяркоўваць казку з дапамогай адваротнага дыялога, які прадугледжвае фарміраванне культуры мыслення, гуманістычнага стылю паводзін. Настаўнік, працуючы над казкай, можа выкарыстоўваць наступныя віды заданняў: чытанне па ролях; інсцэніроўку казкі; розныя віды пераказаў (сціслы, падрабязны, творчы, індывідуальны і калектыўны); вуснае маляванне, складанне пытанняў да твора, парад таму ці іншаму персанажу; абмеркаванне мультфільмаў, спектакляў. На аснове прыказак, прымавак, пацешак, скорагаворак, забаўлянак, лічылак, апавяданняў, вершаў з дзецьмі вядзецца шчырая размова пра агульначалавечыя каштоўнасці: любоў да Радзімы і павагу да старэйшых, дабрыню, ветлівасць, сяброўства, чалавечнасць і міласэрнасць.

Нельга недаацэньваць значнасць вусных і пісьмовых пераказаў у пачатковых класах. Яны садзейнічаюць не толькі развіццю мовы, але і ўзбагачэнню жыццёвага вопыту, фарміраванню духоўнага свету асобы. Для фарміравання нацыянальнай свядомасці малодшых школьнікаў выкарыстоўваюцца творы аб роднай мове, аб краіне, легенды і паданні пра ўзнікненне Беларусі, беларускіх гарадоў і мястэчак. Лепш звяртацца да блізкіх вучням гэтага ўзросту тэм: маці, дабрыня, жыццё, зямля, жывёлы, расліны, гісторыя, спадчына; такія тэмы дапамогуць дзецям навучыцца бачыць прыгожае ў навакольным асяроддзі, кожным чалавеку, прыадкрыць таямніцы жыцця.

У сваім развіцці беларусы прайшлі дастатковы шлях, каб многае спазнаць у сваім нацыянальным характары і светапоглядзе. Нідзе так глыбока не даследуецца дух нацыі, як у літаратурных творах. Менавіта з твораў мастацкай літаратуры мы даведваемся, хто мы такія. Найбольшыя магчымасці даюць самі мастацкія творы – своеасаблівы летапіс жыцця краіны і народа. У пісьменнікаў неабходна вучыцца не толькі гаварыць на роднай мове, а найперш усведамляць сябе праз мову часцінкай свайго народа. Карысныя такія займальныя формы працы, як правядзенне разнастайных конкурсаў на лепшае веданне роднай мовы, індывідуальныя заданні, віктарыны, разгадванне рэбусаў, крыжаванак, якія будуць абуджаць пачуццё асабістай адказнасці за захаванне матчынай мовы.

Мяне на працягу год хвалявалі падрыхтоўка і правядзенне ўрокаў беларускага чытання і асабліва пазакласнага чытання ў пачатковых класах. Як і ўсякі настаўнік, імкнуся выявіць пры знаёмстве з творамі дзіцячай мастацкай літаратуры нацыянальны характар, суадносіны нацыянальнага і агульначалавечага. У сваёй рабоце па пазакласнаму чытанню пастаянна выкарыстоўваю літаратурны краязнаўчы матэрыял, які прывівае вучням цікавасць да жыцця, творчасці пісьменнікаў і паэтаў-землякоў. У працэсе правядзення такіх урокаў пазакласнага чытання прадставілася магчымасць жывых эмацыянальных узаемаадносін, дзе самі вучні шляхам эксперыментаў, проб і памылак здабывалі веды пра акружаючыя з'явы. Усё гэта садзейнічала развіццю асобы дзіцяці, бо веды, уменні і навыкі разглядаліся не як мэта, а як сродак развіцця дзяцей.

Прывіць любоў да сваёй спадчыны, да мовы немагчыма без музыкі. Мяне заўсёды вабіла ўвасабленне літаратурных твораў для дзяцей школьнага ўзросту ў музыцы. Роднае беларускае слова, перададзенае ў музыцы, уваходзіла ў душу і сэрца. Старалася гэта зрабіць праз творы народнай музыкі і сучасных кампазітараў. Слова ў спалучэнні з музыкай актыўна ўздзейнічала на вучняў. Тады адбываліся ў класе «святы для душы», развіваліся творчыя і артыстычныя здольнасці дзяцей. Яркія фарбы музычна-паэтычных вобразаў садзейнічалі іх эстэтычнаму выхаванню, выхаванню нацыянальнай самасвядомасці.

Трэба верыць, што беларускай мове належыць вялікая будучыня. Сведчаннем таму з'яўляецца яе багацце і сіла, якую трэба раскрываць перад малодшымі школьнікамі, што можа зрабіць родную мову найлепшай базай моўнай адукацыі, выхавання новага пакалення. Праз мову адбываецца далучэнне асобы да светапогляду народа, яго гісторыі, культуры, сістэмы маральных і духоўных каштоўнасцей.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Навучанне беларускай літаратурнай мове малодшых школьнікаў мае на мэце зберагчы мову і культуру народа, засцерагчы ад усяго таго, што можа пашкодзіць нацыянальным традыцыям. Вучыць роднай мове нашых дзяцей – клапаціцца аб іх будучыні, аб будучыні беларускага народа. Само навучанне і ўжыванне беларускай мовы становіцца з’явай агульнанароднай і нацыянальнай культуры. У розныя часы самым надзейным і эфектыўным спосабам захавання і развіцця культурных традыцый і мовы была моўная адукацыя падрастаючага пакалення, якое ў сваю чаргу будзе вучыць і перадаваць назапашаны культурны вопыт сваім нашчадкам.

Менавіта школа павінна даць не толькі веды, але і развіць густ да беларускага слова, адкрыць радасць далучэння да яго хараства. Росквіту агульначалавечых каштоўнасцей дапамагае якраз раскрыццё патэнцыялу мовы. Дзеці павінны ўсведамляць сябе беларусамі, добра ведаць не толькі родную мову, але і гісторыю і культуру сваей Бацькаўшчыны. Калі мы паважаем сябе і сваіх продкаў, то павінны даражыць родным словам. Сёння гаварыць пра выхаванне патрыёта Беларусі, свядомага прадстаўніка нацыі – значыць дбаць пра будучыню Бацькаўшчыны.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Паўлоўскі, І.І. Канцэпцыя моўнай адукацыі малодшых школьнікаў / І.І. Паўлоўскі. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http: // adu.by/uchitelyu/uchebno-metodicheskoe-obespechenie-doshkolnogo-obshchego-srednego-i-spetsialnogo-obrazovaniya/kontseptsii-uchebnykh-predmetov. – Дата доступа: 07.02.2019.
2. Учебные программы для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. III класс. – Минск: Национальный институт образования, 2017. – 208 с.
3. Учебные программы для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. IV класс. – Минск : Национальный институт образования, 2018. – 212 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова